**А. Гарбоўская**

# ІДЭЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСКАГА КРАЮ
## (паводле матэрыялаў газеты «Мужыцкая праўда»)

Становішча простага селяніна і ўключэнне беларускіх зямель у склад Расіі – вось дзве галоўныя тэмы майго даследавання.

Колькі цярпеў беларускі народ розныя здзекванні: і калі быў у складзе Польшчы, і калі ў складзе Расійскай дзяржавы. Але больш за ўсё розныя здзекванні цярпелі простыя беларускія сяляне, і вызначыўся сярод іх мужны хлопец – Кастусь Каліноўскі. Падчас паўстання 1863–1864 гг. ён з’яўляўся кіраўніком «чырвоных левых», якія ставілі сваёй мэтай не вяртанне Беларусі да Рэчы Паспалітай, як гэтага жадалі «белыя» і «чырвоныя правыя», а самавызначэнне Беларусі як асобнай дзяржавы. К. Каліноўскі прапагандаваў ідэю народнай сялянскай рэвалюцыі, што паказвае яго рашучасць дзейнічаць дзеля сваёй краіны. Ён адкрываў вочы сялянам. Нягледзячы на ўсё, што рабілася на той момант на далучаных землях, у яго хапіла мужнасці паказаць людзям усё, што ёсць на самай справе, асабліва на старонках газеты «Мужыцкая праўда».

Кастусь Каліноўскі звяртаўся з заклікамі да аб’яднання сялян, паколькі лічыў, што можна перамагчы паноў, цара, што просты люд здольны на нешта большае, чым проста рабіць на зямлі. Расія выкарыстоўвала беларускі народ для дасягнення сваіх мэтаў. Яна не ўспрымала Беларусь усур’ёз. Мэтай К. Каліноўскага было палепшыць стан сялянства і вызваліць беларускі народ ад расійскага гнёту. К. Каліноўскі казаў, што Расія абдзірае беларускі народ. Але шмат людзей проста баяліся нешта выказаць супраць улады, бо ведалі, што ім за гэта будзе. Паны ніяк не былі зацікаўлены ў самавызначэнні Беларусі, бо яны мелі багацце, што давала ім устойлівае становішча. “*Ронд – гэта зусім так сама, як чалавек. I як чалавек мае галаву на тое, каб думаў, а рукі і ногі, каб зрабіў так, як задумаў, так ронд мае цара, каб рондзіў, а чыноўнікаў па ўсіх местах і мястэчках, каб рабілі, як цар захоча...*”. У гэтых радках чацвёртага нумара газеты вельмі добра паказана тое, што Каліноўскі быў супраць цара, супраць самадзяржаўя. У сваёй газеце ён паказвае прычыну ўсіх бед народа. Бо расійскія ўлады навязваюць толькі свае ідэі. Чыноўнікі – гэта людзі рускага паходжання. Калі хто хацеў неяк вызначыцца, то цар высылаў іх у Сібір. Галоўны тэзіс «Мужыцкай праўды» ўтрымліваецца ў адной фразе: “*Не народ для ўрада, а ўрад для народа*”. Па сутнасці Каліноўскі і яго паплечнікі ў гэтых словах акрэслілі галоўную ідэю дэмакратыі: вызваленне беларусаў; не адступаць, адстойваць свае правы, менавіта сяляне могуць адыграць вялікую ролю ў самавызначэнні Беларусі. I хоць паўстанне было падаўлена, аднак ідэі Каліноўскага не згаслі, а сталі падмуркам для змагання за вольную будучыню беларускага народа.